Источник: "Краязнаўчая газета" - 2015-02-05

# Прызванне — архітэктура

**25 студзеня 60-гадовы юбілей адзначыў акадэмік, доктар архітэктуры, доктар гістарычных навук, прафесар, дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Аляксандр Лакотка.**



*А. Лакотка*

Аляксандр Іванавіч – знаны вучоны ў галіне мастацтвазнаўства, у прыватнасці, гісторыі архітэктуры і народнага дойлідства, аховы гісторыка-культурнай спадчыны і развіцця на яе аснове турыстычных рэкрэацыйных зонаў. Ён аўтар больш чым 270 навуковых працаў, у тым ліку 30 манаграфіяў. А. Лакотка – лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» (2008) у складзе аўтарскага калектыву за падрыхтоўку шматтомнай працы «Беларусы».

З нагоды юбілею ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылося ўрачыстае пасяджэнне, у якім удзельнічалі прадстаўнікі Прэзідыума НАН Беларусі, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, вышэйшых навучальных установаў, вучоныя, архітэктары, мастацтвазнаўцы ды іншыя.

Пад час мерапрыемства адбылося адкрыццё выстаўкі «Архітэктурны партрэт краіны ў гісторыка-культурным падарожжы "Адкрываючы Беларусь..."», падрыхтаванай супрацоўнікамі бібліятэкі і прысвечанай навукова-даследчыцкай дзейнасці А. Лакоткі, быў паказаны відэафільм «Прызванне – архітэктура». Сярод экспанатаў выстаўкі – асноўныя публікацыі вучонага, а таксама энцыклапедычныя выданні, у склад рэдкалегіі якіх уваходзіў А. Лакотка.

Матэрыялы выстаўкі не толькі дэманструюць асноўныя вынікі творчага жыцця вучонага, але дапамагаюць скласці архітэктурны партрэт нашай краіны праз гісторыка-культурную адметнасць асобных рэгіёнаў Беларусі, гарадоў і мястэчак, праз помнікі народнага драўлянага дойлідства, сакральна-манументальныя збудаванні розных канфесіяў, унікальныя прыродна-культурныя беларускія ландшафты.

*Паводле інфармацыі ЦНБ НАН Беларусі*
*Фота Наталі КУПРЭВІЧ*



*Георгій Кісялёў*

**Грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры» і «Краязнаўчая газета» віншуюць Аляксандра Іванавіча Лакотку з юбілеем і жадаюць яму добрага здароўя і плённай працы на карысць нашай Бацькаўшчыны.**



*Юбіляра віншуе хор «Акадэмія»*